ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ. СПРАВА НЕАБЫЯКАВЫХ.
ГЕРОІ НОВАГА ПРАЕКТА — НАСТАЎНІКІ-ПАДЗВІЖНІКІ, РУПЛІВЫЯ ГАСПАДАРЫ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ, ЯКІЯ СВАІМ ПРЫКЛАДАМ ВЫХОЎВАЮЦЬ У ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ ПРАЦАВІТАСЦЬ, НЕАБЫЯКАВАСЦЬ, ЖАДАННЕ ПРЫКЛАДАЦЬ НАМАГАННІ, КАБ РОДНЫ КРАЙ КВІТНЕЎ І РАЗВІВАЎСЯ.
Выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА
t.me/nastgaz
29 лістапада 2024 года

# Траекторыя — профіль

**Прафарыентацыйная работа ў БДАТУ — працэс не сезонны, а круглагадовы. Асабліва цеснае ўзаемадзеянне складваецца з аграрнымі класамі.**

Формы супрацоўніцтва з вучнямі старшых класаў пастаянна абнаўляюцца і пашыраюцца. Выкладчыкі па-ранейшаму ездзяць па школах з прэзентацыямі і фільмамі, расказваюць пра факультэты і спецыяльнасці, парадак паступлення і ўмовы навучання, ільготную траекторыю паступлення мэтавікаў, перавагі вучобы ва ўніверсітэце, дзе акрамя аграрных спецыяльнасцей шмат інжынерных. Таксама яны запрашаюць патэнцыяльных абітурыентаў адзін раз убачыць усё на свае вочы: у БДАТУ праводзяцца дні адкрытых дзвярэй, а таксама прафарыентацыйныя акцыі "Студэнт на адзін дзень".

Навучэнцы профільных класаў, якія на факультатыве "Уводзіны ў аграрныя прафесіі" вывучаюць разнастайнасць сельскагаспадарчых машын, пытанні энергетыкі, частыя госці на занятках ва ўніверсітэцкіх лабараторыях, дзе на высокім узроўні вядзецца практыка-арыентаваная падрыхтоўка будучых аграрыяў.

Так, напрыклад, некалькі дзясяткаў школьнікаў са Стаўбцоўскага раёна нядаўна пабывалі на экскурсіі ва ўніверсітэце і зазірнулі ў вучэбна-выставачны комплекс, дзе прадстаўлена каля пяцідзесяці сельгасмашын. Ад старшага выкладчыка кафедры сельскагаспадарчых машын аграмеханічнага факультэта БДАТУ Дзяніса Яноўскага старшакласнікі даведаліся цікавыя падрабязнасці пра спецыфіку работы тэхнікі па апрацоўцы глебы, унясенні угнаенняў, хімічнай абароне раслін, нарыхтоўцы кармоў, уборцы збожжавых і пасляўборачнай апрацоўцы збожжа і бульбы. Гаворачы пра аграрныя дроны, педагог паведаміў, чым яны карысныя ў дакладным земляробстве. Цікава, што гэтая інфармацыя зацікавіла найперш дзяўчат.

Вольга Рушанян, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, настаўніца хіміі, якая вядзе заняткі профільнага факультатыву ў Старасвержанскай сярэдняй школе Стаўбцоўскага раёна, дзе другі год працуюць аграрныя класы, называе такія сустрэчы карыснымі і вельмі цікавымі.

— З навучэнцамі нашай школы мы сюды прыязджаем ужо другі раз. І хлопцам, і дзяўчатам вельмі спадабаліся заняткі ў вучэбнай лабараторыі, захапленне выклікаў універсітэцкі спартыўны комплекс. Дарэчы, сёлета два выпускнікі нашай школы, хоць яны і не вучыліся ў агракласе, паступілі па мэтавым накіраванні ў БДАТУ. Вучыцца тут ім вельмі падабаецца. Даведаўшыся пра перавагі паступлення мэтавікаў, два адзінаццацікласнікі ўжо, ведаю, збіраюцца ўзяць накіраванне ў асноўнага заказчыка кадраў нашага раёна — ААТ "Агра-Нёманскі".

Дарэчы, у БДАТУ на працягу многіх гадоў паступаюць некалькі абітурыентаў са Стаўбцоўскага раёна.

**Марына КУНЯЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**